Навукова-метадычны часопіс
Выдаецца штомесячна,
з II паўгоддзя 2011 года
Зарэгістраваны ў Міністэрстве
інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Пасведчанне ад 25.04.2011 № 1440

АіВ
АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ
выдавецтва

Серыя «У дапамогу педагогу»
заснавана ў 1995 годзе

# Гісторыя і грамадазнаўства

№ 1 (19) 2013

Заснавальнік і выдавец —
РУП «Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"»
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь

Вул. Будзённага, 21,
220070, г. Мінск;
тэл.: 297-93-20 (адк. сакратар),
297-93-22 (аддзел маркетынгу),
факс: 297-91-49
e-mail: aiv@aiv.by,
http://www.aiv.by



РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

Мікалай Іосіфавіч МІНІЦКІ — галоўны рэдактар, доктар гістарычных навук, прафесар
П. Р. МАРТЫСЮК — першы намеснік галоўнага рэдактара, доктар філасофскіх навук, дацэнт
Н. М. ГАНУШЧАНКА — намеснік галоўнага рэдактара, кандыдат гістарычных навук
Л. В. САЛАМАХА — адказны сакратар
Л. В. ЖЭРКА
В. М. ВАРАНОВІЧ
С. А. КУДРАЎЦАВА
Л. І. ШЧЭНІКАВА

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА

В. У. ПАЗНЯКОЎ — старшыня рэдакцыйнай рады, доктар філасофскіх навук, прафесар
Я. М. БАБОСАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік
С. А. БАЛАШЭНКА, доктар юрыдычных навук, прафесар
В. В. БУШЧЫК, доктар палітычных навук, прафесар
П. А. ВАДАП'ЯНАЎ, доктар філасофскіх навук, прафесар
М. І. ВІШНЕЎСКІ, доктар філасофскіх навук, прафесар
В. В. ДАНІЛОВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
М. М. ЗАБАЎСКІ, доктар гістарычных навук, прафесар
А. А. КАВАЛЕНЯ, доктар гістарычных навук, прафесар
В. А. КАПРАНАВА, доктар педагагічных навук, прафесар
П. С. КАРАКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
Г. У. КАРЗЕНКА, доктар гістарычных навук, прафесар
І. В. КАРПЕНКА
Г. А. КОСМАЧ, доктар гістарычных навук, прафесар
У. С. КОШАЛЕЎ, доктар гістарычных навук, прафесар
М. А. МАЖЭЙКА, доктар філасофскіх навук, прафесар
С. В. ПАНОЎ, кандыдат педагагічных навук, дацэнт
С. В. РАШЭТНІКАЎ, доктар палітычных навук, прафесар
С. М. ХОДЗІН, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
І. І. ЦЫРКУН, доктар педагагічных навук, прафесар

# Некаторыя метадалагічныя праблемы айчыннай гістарыяграфіі

**А. А. Каваленя**, доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі



Гісторыя — навука асаблівая. Дакладнасць высноў гістарычнай навукі фарміруецца на працягу многіх дзесяцігоддзяў і стагоддзяў. Гісторык заўсёды ведае непараўнальна больш за сучаснікаў і ўдзельнікаў непасрэдных падзей, калі выкарыстоўвае навуковую метадалогію, абапіраючыся на найважнейшы прынцып гістарычнага пазнання — гістарызм.

Мінулы год у нашай краіне быў абвешчаны «Годам кнігі», таму можна сказаць, што выданні навуковай кніжнай прадукцыі пад грыфам Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ўвогуле Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі з'яўляюцца важным укладам у папулярызацыю не толькі нацыянальнай навукі, але і культуры, і мовы, паколькі значная частка кніжнай прадукцыі пад грыфам Аддзялення выходзіць на беларускай мове. Заўважу, што ўнёсак акадэмічных навукоўцаў у падрыхтоўку і выданне літаратуры даволі трывалы. Напрыклад, за 2006—2010 гг. вучоныя апублікавалі больш за 7,5 тыс. артыкулаў і тэзісаў, падрыхтавалі і выдалі звыш 430 кніжных выданняў, у тым ліку 327 манаграфій.

Можна назваць цэлы шэраг прац, якія выклікалі станоўчы грамадскі рэзананс і высока ацэнены навуковай супольнасцю. Сярод іх — калектыўная манаграфія «Беларусь: Народ. Дзяржава. Час» (2009), якая стала пераможцам у намінацыі «Лепшае масава-палітычнае выданне» Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі — 2010» і была адзначана Гран-пры на Міжнародным конкурсе «Навуковая кніга — 2010». Вялікую цікавасць выклікаў I том «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», выдадзены сумесна з Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, РУП «Белкартаграфія», які адлюстроўвае перыяд ад з'яўлення чалавека на тэрыторыі Беларусі да 1569 г. Гэта выданне не мае аналагаў на прасторы СНД. Станоўча ацэнена навукоўцамі калектыўная манаграфія «Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць» (2009) і фотаальбом «Зямля сілы. Белавежская пушча» (2009). Добрым вынікам стаў выхад да 70-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР зборніка дакументаў і матэрыялаў «Ты з Заходняй, я з Усходняй нашай Беларусі...» у 2 кнігах (2009). Падзеяй у грамадскай думцы стаў выхад кніг серыі «Старажытныя гарады Беларусі». Нашы дасягненні — гэта творчая праца навукоўцаў. Выказваем словы ўдзячнасці дырэктару Інстытута гісторыі В. В. Даніловічу, намесніку па навуковай рабоце М. Г. Жылінскаму, кіраўнікам цэнтраў В. М. Ляўко, М. У. Смяховічу, загадчыку аддзела А. М. Літвіну, загадчыку сектара В. В. Яноўскай.

Што тычыцца выданняў па метадалогіі і гістарыяграфіі, то напачатку 2011 г. выйшла калектыўная манаграфія «На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы», а таксама фундаментальныя працы «Беларусь — страницы истории», першая частка «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI стагоддзя», завяршаецца праца над другой часткай і другім томам Вялікага гістарычнага атласа. У выданнях аналізуюцца канцэптуальныя метадалагічныя падыходы, якія прымяняліся і прымяняюцца ў дачыненні да гісторыі Беларусі. Паказваецца месца айчыннай гістарычнай навукі сярод іншых, у першую чаргу гістарыяграфій суседніх краін. Аўтары шмат у чым прадставілі новы погляд на гістарычны працэс, асабліва на фарміраванне беларускай дзяржаўнасці.

Значны ўклад у развіццё метадалогіі даследаванняў гісторыі Беларусі зрабілі ў сваіх публікацыях У. Н. Сідарцоў, А. М. Нечухрын, М. І. Мініцкі, М. У. Смя-

ховіч, М. І. Мацюшэўская, В. М. Шутава, А. В. Кур'яновіч, М. А. Сакалова і іншыя. І гэта, нягледзячы на тое што праблематыка тэарэтыка-метадалагічных аспектаў гістарычных даследаванняў апынулася ў полі зроку айчынных гісторыкаў толькі ў апошнія дзесяцігоддзі — у 1990-я гг. былі апублікаваны падручнікі па метадалогіі гісторыі, а даследчыкі звярнуліся да вывучэння метадалагічных праблем.

Зразумела, што пошук метадалагічных падыходаў не можа адбывацца ў замкнутай прасторы. Па гэтай прычыне вельмі важнай задачай супольнасці беларускіх гісторыкаў з'яўляецца наладжванне навуковага дыялогу з замежнымі калегамі. Толькі ў 2012 г. на базе Інстытута гісторыі адбыўся круглы стол на тэму «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў амерыканскай і ўкраінскай гістарыяграфіі», арганізаваны сумесна з прадстаўнікамі паўночна-амерыканскай і ўкраінскай гістарычных школ. Такім чынам, можна канстатаваць, што існаванне незалежнай Рэспублікі Беларусь, беларускай гістарычнай навукі павялічвае цікавасць да нашай краіны, у тым ліку і з боку паўночна-амерыканскіх гісторыкаў. І разам з тым абавязвае нас быць адкрытымі да навуковай дыскусіі па праблемах гісторыі Беларусі і метадалогіі яе даследавання.

У гэтым годзе адбыўся шэраг канферэнцый, прысвечаных 200-гадоваму юбілею вайны 1812 г., якая закранула і Беларусь. Яна абвастрыла пытанні, звязаныя з гісторыяй беларускай дзяржаўнасці, па якіх апошнімі гадамі вядуцца шматлікія навуковыя дыскусіі. Інстытут гісторыі НАН Беларусі разам з прадстаўніцтвам Рассупрацоўніцтва ў Беларусі правёў шэраг канферэнцый і іншых маштабных мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай тэме. Як прыклад можна прывесці Міжнародны круглы стол «Отечественная война 1812 года в исследованиях белорусских и российских учёных» (Гомель — Мазыр, 22—23 снежня 2011 г.) і Міжнародную канферэнцыю «Отечественная война 1812 года в судьбах народов России и Беларуси» (Магілёў, 25—27 ліпеня 2012 г.).

Кажучы пра дыскусіі вакол тэмы 1812 г., мы зыходзім з таго, што некаторыя ангажаваныя палітыкі спрабуюць адгарадзіць гістарычным плотам Беларусь ад Расіі. У гэты працэс, а так было ўжо не раз, уцягваюць гісторыкаў, каб у палітычнай барацьбе выкарыстаць гераічныя і трагічныя ваенныя падзеі. У шэрагу публікацый сцвярджаецца, што вайна 1812 г. для беларусаў не з'яўлялася Айчыннай. Давайце звернемся да найважнейшага для нас метадалагічнага прынцыпу гістарызму, які патрабуе вывучаць мінулае з улікам канкрэтна-гістарычнага становішча адпаведнай эпохі, ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці падзей. Рабіць па-іншаму — значыць дзейнічаць не толькі антынавукова, але і пазбаўляць права на праўду аб тых, хто разам з рускімі змагаўся каля Барадзіно, трымаў у аблозе французскія гарнізоны на акупаванай тэрыторыі Беларусі, вёў партызанскую барацьбу. Не прызнаваць гэта — значыць не паважаць уласную гісторыю, працу многіх пакаленняў беларусаў, хто разам з іншымі народамі ствараў адну з найвялікшых дзяржаў, дзе зараджалася і сучасная Беларусь. Гісторыя павінна садзейнічаць кансалідацыі народа, вучыць верацярпімасці, а не нагнятаць супрацьстаянне і канфлікты. У гісторыі было ўсё, але гонарам народа заўсёды і ва ўсе часы былі перамогі і дасягненні.

Думаю, сёння нам неабходна больш актыўна ўздымаць праблему інтэграцыі гуманітарных ведаў. Гэта тым больш актуальна, што гістарычная навука ў параўнанні з іншымі грамадска-гуманітарнымі навукамі выступае як навука комплексная, інтэгральная. Яна мае справу з усімі грамадскімі з'явамі і працэсамі, якія імі вывучаюцца. Вядома, перанос ідэй і пасылак навуковага пазнання з адной вобласці навукі ў іншую не павінен быць механічным, каб прадэманстраваць інтэграцыйнасць даследавання. Важна ўмела і творча выкарыстоўваць паняційна-катэгарыяльны апарат і метады даследаванняў розных галін ведаў. Гэта дапаможа не толькі творчаму пошуку і інтэграцыі, але і з'яўленню новых ідэй, падыходаў і метадаў, якія дапамогуць раскрыць многія складаныя падзеі і факты не толькі далёкага мінулага, але і сучаснасці. Гэта асабліва важна сёння, каб своечасова адказваць на выклікі, што нараджаюцца ў сусветным грамадстве, якое глабалізуецца. На мой погляд, гэта патрабуе не толькі міждысцыплінарнага характару працы гісторыка, але і цесных творчых кантактаў паміж усімі абласцямі сацыяльна-гуманітарных навук. Сучасныя тэндэнцыі развіцця і інтэграцыі навукі сведчаць аб пранікненні ў грамадска-гуманітарныя даследаванні матэматычных і прыродазнаўчых метадаў, што павышае глыбіню і дакладнасць вынікаў нашых навук. Упэўнены,

такі падыход толькі ўзбагаціць навуковыя гістарычныя даследаванні, дапаможа з найбольшай аб'ектыўнасцю адлюстроўваць рэчаіснасць. Тым больш што аб'ектам пазнання гістарычнай навукі з'яўляецца сукупнасць з'яў, падзей і працэсаў грамадскага жыцця. Задача гісторыкаў — з найбольшай аб'ектыўнасцю і дакладнасцю, як патрабуе прынцып гістарызму, прадставіць іх грамадству.

# Спасцігаем гісторыю

**В. В. Даніловіч,** кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі



У сучасных умовах, зыходзячы з дзяржаўных пазіцый, Інстытут гісторыі НАН Беларусі не толькі ажыццяўляе навуковыя даследаванні, але і імкнецца развіваць прыкладны напрамак сваёй дзейнасці, пашыраць гістарычную асвету, прапагандаваць гісторыка-культурныя традыцыі Бацькаўшчыны. Разам з тым мы выдатна ўсведамляем праблемы, якія стаяць перад сучаснай гістарычнай навукай Рэспублікі Беларусь, і праводзім работу па аб'яднанні намаганняў гісторыкаў для іх вырашэння.

Намаганні вучоных Інстытута гісторыі НАН Беларусі, гістарычных кафедраў ВНУ ў рамках выканання заданняў падпраграмы «Гісторыя, духоўная і матэрыяльная культура беларускага народа» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў на 2011—2015 гг. «Гуманітарныя навукі як фактар развіцця беларускага грамадства і дзяржаўнай ідэалогіі» пры падтрымцы кіраўніцтва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў, за што мы ўдзячны акадэміку-сакратару А. А. Каваленю, канцэнтруюцца на актуальнай праблематыцы, канцэптуальных навуковых і метадалагічных пытаннях у трактоўцы шматвекавой гісторыі беларускага народа.

Можна канстатаваць узрастанне цікавасці да метадалогіі даследавання гісторыі. Па сутнасці, сённяшні форум з'яўляецца традыцыйным, бо гэта ўжо трэцяя канферэнцыя, прысвечаная метадалогіі даследаванняў гісторыі Беларусі. Першая адбылася 26—27 кастрычніка 2006 г., другая — 22—23 кастрычніка 2008 г. Гэтыя метадалагічныя канферэнцыі ўзнялі цэлы шэраг важных для айчыннай гістарычнай навукі пытанняў.

Так, была агучана прапанова праводзіць на ўзроўні агульнанацыянальных выданняў навуковыя дыскусіі па актуальных праблемах метадалогіі, гістарыяграфіі, крыніцазнаўства і ўвогуле гісторыі Беларусі. Адзначана запатрабаванасць аналізу гістарычных каранёў і крыніц беларускай дзяржаўнасці, шляхоў, формаў і метадаў яе эвалюцыі, фарміравання ідэалогіі дзяржаўнасці на розных этапах жыцця і дзейнасці народа.

У сувязі з 90-годдзем абвяшчэння БНР вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў 2008 г. у рэдакцыі газеты «СБ — Беларусь Сегодня» быў арганізаваны круглы стол, прысвечаны гісторыі Беларускай Народнай Рэспублікі. Падзеяй дзяржаўнай значнасці стала Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь: этапы станаўлення дзяржаўнасці (да 90-годдзя ўтварэння БССР)», праведзеная 18 снежня 2008 г. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел больш за 230 навукоўцаў, прадстаўнікі органаў улады, дыпламатычнага корпуса, а таксама дэпутаты: Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Б. В. Батура, глава Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі